УДК 821.161.3

**Н.М. Дамброўская**

# Проза Вячаслава Адамчыка: пачатак станаўлення

Вячаслаў Адамчык – прадстаўнік пасляваеннага пакалення мастакоў слова – прыйшоў у літаратуру ў канцы 50-х гадоў XX стагоддзя, у перыяд часовай дэмакратызацыі жыцця пасля выкрыцця культу асобы Сталіна. Гэты перыяд вызначаўся адраджэннем ідэалаў свабоды асобы, думак, мыслення, ростам рамантычнага настрою, верай у лепшую будучыню. Адраджаліся таксама і агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці, а следам за гэтым працэсам – абнаўляліся ідэйна-эстэтычныя прынцыпы пісьма, якое ўсё больш арыентавалася на праўду, на асабістую зацікаўленасць мастакоў тым, пра што яны пішуць. Узрастаў патэнцыял суб'ектывізму, а гэта значыць – і лірызму ў літаратуры.

Першыя крокі на ніве літаратуры былі зроблены В. Адамчыкам у жанры апавядання – самым мабільным і аператыўным (зборнікі апавяданняў «Свой чалавек» (1958), «Млечны шлях» (1960), «Міг бліскавіцы» (1965). Менавіта апавяданні былі тым падмуркам, на аснове якога фарміраваўся адметны і самабытны індывідуальны творчы метад і стыль мастака, акрэслівалася праблематыка яго твораў. Адметнасць аўтарскага індывідуальнага стылю вызначылася ў ранніх творах пісьменніка найперш у глыбокім лірызме, якім насычаны многія іх старонкі.

У апавяданнях, а пазней і ў раманах Вячаслава Адамчыка асабліва моцна выявіўся тып лірычнага пачатку, які вызначаны літаратуразнаўцамі як лірызм аўтабіяграфічнага паходжання. Найчасцей у сваіх творах аўтар ідзе ад асабіста перажытага, і тым самым актывізуюцца пазітыўныя ці адмоўныя разнавіднасці пафасу, абвастраюцца пачуцці. Менавіта суб'ектыўныя адносіны да адлюстраванага вядуць да кампазіцыйнай раскаванасці, свабоды формы твораў, параджаюць пастаянныя экскурсы ў мінулае і будучыню, павялічваюць вагу ў тэксце маналагічнага пачатку, спавядальнасці, што афармляецца адпаведным чынам. Пакладзеныя ў аснову апавяданняў падзеі, факты з уласнай біяграфіі празаіка-заходніка з Наваградчыны – кутка маленства, дзе ён гадаваўся і рос, таксама акумулююць у значнай ступені пачуццё асабістай зацікаўленасці аўтара падзеямі, дапамагаюць яму пераадолець прыземленае бытапісальніцтва і абстрактны рытарызм.

Фактар аўтабіяграфізму не адзіны, які ў многім спрыяў і спрыяе працэсу лірызацыі эпасу. Другі можна вызначыць як фактар рэгіянальнасці (тэрмін умоўны – Н.Д.). Малая радзіма – у выпадку з Уладзімірам Караткевічам – велічнае, старадаўняе, легендарнае Падняпроўе, – думкі і мары пра яе лёс паспрыялі кандэнсацыі лірычнага хвалявання ў творах гэтага пісьменніка, што і сам ён нібы засведчыў у апавяданні «У шалашы», шчыра захапіўшыся роднай сэрцу прыродай: «[...] быў світанак. Сонца выплывала з-за пяскоў і лазы левабярэжжа. І хвалі былі зеленавата-блакітныя. І на адзін кароткі момант самыя грабянцы іх успыхнулі крывавым, трывожным, а потым апельсінавым агнём, быццам там вось-вось павінен быў вынырнуць нехта прыгожы, пранікліва-пяшчотны, той, што прыносіць на зямлю вечную цеплыню і радасць...» [1]. Пісьменнікам-лірыкам, рамантыкам даўно прызнаны і Іван Навуменка. І ў першую чаргу суб'ектыўнасць, лірычная ўсхваляванасць прасякве

тыя яго творы, у якіх фігуруе родны край – чыгуначная станцыя Васілевічы на гомельскім Палессі, навакольны лес-чараўнік, што гадуе мары юнакоў і дзяўчат (апавяданні з кніг «Хлопцы-равеснікі», «Верасы на выжарынах» і інш., старонкі раманнай трылогіі «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці»). Няпоўнымі, аднакаляровымі сталіся б раманы Віктара Казько без краявідаў малой радзімы, без Палесся – Мележавы.

Вячаслаў Адамчык як майстар лірычнай прозы займае годнае месца ў шэрагу гэтых і іншых песняроў, шануе з ранняй пары традыцыі нацыянальнай літаратуры, стваральнікі якой адкрываюць душы наросхрыст чытачу, змяшчаюць у сваіх сэрцах болі і радасці чалавечыя. На думку многіх літаратуразнаўцаў, поспех спадарожнічаў Адамчыку тады, калі мастак слова ў сваіх творах быў бліжэй да «каранёў», да роднай зямлі, да сваёй памяці. У шчымлівым апісанні доўгачаканай сустрэчы з роднай вёскай, з маці («Пах летняй травы»), ва ўсхваляваным узнаўленні памяццю вобраза мілай яго сэрцу рэчкі Ятранкі («Жывая вада») адчуваецца глыбіня і сардэчная прывязанасць пісьменніка да родных мясцін: «Ятранка... Ты цячэш праз маё сэрца. Ты помніш – на тваім беразе радзіўся я. Яшчэ не раз прыйду я да цябе, каб зачарпнуць у прыгаршчы твае жывучае святое вады і напіцца» [2].

На нашу думку, творы В. Адамчыка «Жывая вада», «Пах летняй травы» – хутчэй не апавяданні, а лірычныя замалёўкі, імпрэсіі, вершы ў прозе. Апошнія, па В.В. Кожынаву, уяўляюць сабой «прамежкавую форму паміж паэзіяй і прозай» [3]. Героі згаданых твораў жывуць успамінамі, мараць вярнуцца на сцежкі свайго маленства, на бераг роднай ракі, як пра самае дарагое ў жыцці. «Жывая вада», «Пах летняй травы», напісаныя на ўсхваляванай лірычнай ноце, не маюць выразна акрэсленага падзейнага сюжэта – ён размываецца хваляй пачуццяў. Адамчык умее спыніць імгненне, занатаваць няўлоўнасць эмацыянальнага руху душы, надаць слову выразнасць колеру, гуку, паху. Асноўны змест вышэйназваных твораў перадаецца як успамін аўтара падчас сустрэчы з роднымі мясцінамі. Гэта своеасаблівы ўспамін-вяртанне, успамін-узнаўленне былых перажыванняў. Здзіўляе паўната гэтага ўзнаўлення, яго выразнасць і дакладнасць, эмацыянальная адпаведнасць рэальна перажытаму аўтарам і рэцыпіентамі мастацкага тэксту. В. Адамчык часта выводзіць свае пачуцці, перажыванні з успрымання прыроды, якая з'яўляецца і фонам дзеяння, і адначасова актыўным сродкам стварэння ўзнёслага, светлага настрою. Чалавек і прырода выступаюць як непадзельная, гарманічная цэласнасць. Так, у лірычных замалёўках «Жывая вада», «Пах летняй травы» Адамчык стварае ўзнёслы настрой, які павінен засведчыць далучэнне чалавека да чагосьці таямнічага і адвечнага, што і стала лейтматывам гэтых твораў. Форма ж успамінаў спрыяе стварэнню спавядальна-даверлівай інтанацыі – адпаведніка маляўнічай прыроды яго «малой радзімы» – Навагрудчыны, ажыўляе часы дзяцінства, дае магчымасць мастаку вольна перамяшчацца ў прасторы і часе. Галоўны лейтматыў гэтых і многіх іншых апавяданняў пісьменніка – любоў і замілаванасць – нараджаецца дзякуючы адчуванню еднасці чалавека з родным краем, блізкасці да яго адвечных і таямнічых загадак. Як і ў Уладзіміра Караткевіча. Дзякуючы лірызацыі пісьма, звыклае і будзённае пад пяром сапраўднага майстра асвечваецца, становіцца паэтычным і святочным; дэтальныя, падрабязныя апісанні вясковага побыту працуюць на высокі пафас, узрушанасць, эмацыянальнасць. І тут цяжка пагадзіцца з Я.Р. Лецкам, які лічыць, што «Пах летняй травы», напрыклад, не вызначаецца глыбінёй думкі, арыгінальнасцю мастацкай формы, бо яго аўтару «не ўдалося перадаць эмацыянальнага нарастання ці то радасці, ці то трывогі ад сустрэчы з блізкім і родным, не ўдалося асвяціць матэрыял колькі-небудзь значнай і арыгінальнай думкай» [4]. Думаецца, што ў адзначаных апавядан-

нях празаіку якраз удалося стварыць адметны мікрасвет, непаўторную эмацыянальную атмасферу шчырага сыноўняга пачуцця любові, замілаванасці і ўдзячнасці да мясцін, дзе прайшло басаногае дзяцінства, якія асвятляюць увесь яго наступны шлях. Больш справядлівы ў сваіх назіраннях, як нам уяўляецца, даследчык В.А. Івашчанка, які адзначае менавіта гэтую асаблівасць творчасці пісьменніка: «Адамчык умее і на малым плацдарме мініяцюры, калі «дае волю» свайму лірычнаму таленту, стварыць настрой, расказаць пра многае» [5].

«Ты цячэш праз маё сэрца» – так звяртаецца Адамчык да роднай рэчкі Ятранкі. Гэты вобраз – сапраўдная лірыка ў прозе. Лірыка, якая разломвае берагі ўзаконенай у эпасе апавядальнасці, перасатварае факты, эпізоды ў суцэльную плынь свядомасці. На гэтай аснове і ажыццяўляецца «змычка» рамантычнага (а лірызм адзін з яго галоўных складнікаў), блізкага мадэрнізму, і рэалістычнага пісьма, уласцівая творчасці празаікаў філалагічнага пакалення і прадстаўнікоў «прозы паэтаў» Кастуся Кірэенкі, Анатоля Вялюгіна, Сяргея Грахоўскага і інш.

Лірызацыя творчасці Вячаслава Адамчыка выклікала відавочную рамантычную афарбоўку, вынікам якой становіцца ўзнёслая эмацыянальная настраёвасць, павышаная экспрэсіўнасць яго ранніх апавяданняў. М.Р. Ярош у свой час, напрыклад, адзначыў, што апавяданню Адамчыка «Міг бліскавіцы» ўласцівая ў пэўнай ступені «загадкавая рамантычнасць», а Я.Р. Лецка заўважыў падабенства стылю апавядання «Ліповы цвет» і стылявой сістэмы Ул. Караткевіча, які таксама, як і яго равеснік, «звычайна бачыў сваіх герояў у яркім рамантычным асвятленні» [4, с. 23]. У апавяданнях В. Адамчыка, на думку даследчыка, выразна адчуваецца «пэўная доля прыўзнятасці, узнёсласці пры абмалёўцы персанажаў» [4, с. 23]. Галоўным героем многіх ранніх апавяданняў Адамчыка («Зоня», «Млечны шлях», «За перагародкай», «Ліповы цвет», «Міг бліскавіцы», «Белы снег», «Урок арыфметыкі») выступае юнак-рамантык, летуценнік – натура шырокай душы, эмацыянальна ўражлівая, шчырая, па-дзіцячы непасрэдная, якая цалкам давяраецца сваім пачуццям, ацэньвае жыццё высокімі крытэрыямі дабра і справядлівасці і страсна імкнецца да здзяйснення свайго ідэалу – да шчасця, чысціні і прыгажосці. Героі пісьменніка – звычайна шукальнікі нязведанага, загадкавага, таямнічага, блізкія да дасягнення шчасця, якое часта ў апошні момант аказваецца ілюзіяй, міражом: «Я любіў, – з горыччу разважае Уладак з апавядання «Зоня», – і першы раз так неспадзявана адбілі ў мяне шчасце, аб якім было столькі думак і непакою» [2, с. 10]; «яму (герою апавядання «Млечны шлях» – Н.Д.) зрабілася шкада сябе, шкада [...] трывожнай радасці, балючага шчасця, першага кахання, мар і спадзяванняў. І сэрца яго зашчымела, калі ён падумаў, што пакідае гэты знаёмы свет, добры і заманлівы, які паўставаў заўсёды там, дзе была Валя. І гэтаму свету прыйшоў канец» [2, с. 37].

Падсвечванне будзённай рэчаіснасці рамантычным пафасам у многім спрыяла ўзмацненню лірызацыі апавяданняў В. Адамчыка, фармаванню яго суб'ектывізаванага стылю. Аднак у той жа час у ранніх творах пачынаючага пісьменніка няма адзнак расплывістай, расслабленай, слязлівай сентыментальнасці, рамантызаваныя вобразы не ствараюцца з дапамогай упрыгожаных тропамі фраз, квяцістых выразаў, не выключаны з рэчыўнага свету, бо празаік пастаянна памятае пра традыцыю нацыянальнага беларускага слоўнага мастацтва не здраджваць вытокам эстэтычнага – рэальнаму жыццю. Як слушна адзначае В.А. Каваленка, у параўнанні з творамі заходнееўрапейскіх рамантыкаў, «рамантычныя сімвалы, створаныя беларускімі пісьменнікамі, менш адцягнутыя, іх змест менш нагадвае пра нейкае другое, незямное жыццё, яны больш рэальныя, як у сваім матэрыяльным быцці, так і па сэнсаваму напаўненню» [6].

З лірызмам ранніх твораў Вячаслава Адамчыка непасрэдна звязана і такая іх асаблівасць, як псіхалагізм. У сучасным літаратуразнаўстве існуюць два падыходы да трактоўкі гэтай эстэтычнай катэгорыі. Некаторыя даследчыкі да псіхалагічных адносяць тыя з іх, дзе прысутнічаюць элементы суб'ектыўнага псіхалагізму. Другія ж прызнаюць існаванне аб'ектыўнага («пушкінскага») псіхалагізму. У ліку апошніх руская даследчыца Л.М. Мышкоўская, якая лічыць, што ў падобных творах «пра псіхіку, пра пачуцці персанажаў сказана вельмі мала, але паказаны, як у драме, іх дзеянні, іх жэсты, іх позіркі, інтанацыя іх голасу, і становіцца праз адзін-два штрыхі зразумелым духоўны воблік кожнага з іх» [7]. У творах прадстаўнікоў суб'ектыўнага псіхалагізму (Максім Гарэцкі, Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Іван Навуменка, Янка Брыль) пераважае аналіз унутраных перажыванняў герояў, якія, як правіла, застаюцца сам-насам са сваімі думкамі, выказваюць свой стан душы ў форме ўнутраных маналогаў. У пісьменнікаў – прадстаўнікоў аб'ектыўнага псіхалагізму (Якуб Колас, Іван Чыгрынаў, Ул. Арлоў) унутраны свет героя, як правіла, падаецца праз ускосную форму выяўлення псіхалагічнага стану – учынкі герояў, ацэнку іх дзеяння іншымі персанажамі, самім аўтарам, прыём «погляду збоку».

Дасягненне майстэрства псіхалагічнага аналізу ў Вячаслава Адамчыка ішло па лініі ад аб'ектыўнага да суб'ектыўнага спосабаў, ад знешнепадзейнага апісальніцтва, ілюстрацыйнасці да вертыкальнага заглыблення ў свет духоўнасці чалавека. Гэты працэс выразна выявіўся ў другой кнізе «Млечны шлях» (1960). Параўнаем, як аўтар перадае душэўнае ўзрушэнне герояў у апавяданнях «Млечны шлях» і «Дзень ранняй восені». У апавяданні «Млечны шлях» чытаем: «Спазмы моцна і балюча сціснулі Косцева горла, ён памкнуўся нешта сказаць, але адчуў, што не мае сілы. У грудзях [...] было нешта пустое і халоднае. Ногі дрыжалі, слабелі, рабіліся нейкія нежывыя, і ён баяўся, каб хаця не ўпасці» [2, с. 28]. У аснове апавядання «Дзень ранняй восені» ляжыць драматычная гісторыя – у хаце з'яўляецца хлопчык – сын гаспадара, пра якога ніхто нічога не ведаў. Высокае эмацыянальнае напружанне, драматызм сустрэчы, пачуццяў ад яе тут ужо перадаецца шматзначнымі жэстамі, праз успаміны, з дапамогай нераўнадушнай інтанацыі, хоць знешне і спакойнай, павольнымі аўтарскімі каментарыямі, выразнай мастацкай дэталлю: «*шырокая глухая* спіна павярнулася, і хлопчык убачыў твар, толькі не гэтакі смутнамяккі, як на фатаграфіі, а сінявата-няголены, вялікі і жывы, з ямачкаю над пераноссем, нібы хто там выціснуў чым *вострым*», «*цяжка ўпала і востра* зазвінела на падлозе пад сталом жалезнае відэльца», «*холадна і востра* зазвінелі нажы і відэльцы», «яна (жонка – Н.Д.) маўчала, *цяжка абярнуўшыся* да яго плячмі» (вылучана намі – Н.Д.) [2, с. 132–133]. Як бачым, аўтар не ставіць перад сабой задачу – як хутчэй знайсці і выкрыць вінаватых, галоўнае для яго – паказаць, як у псіхалагічна складанай, драматычнай сітуацыі паводзяць сябе героі твора, раскрыць іх пачуцці з прыёмамі дасягнення і аб'ектыўнага, і суб'ектыўнага псіхалагізму. У творах В. Адамчыка прысутнічаюць вострыя канфлікты, але яны схаваныя ў глыбіню, у падтэкст, не аголеныя, як у І. Шамякіна, а нібы «абрастаюць» лірызмам, роздумам, «перакрываюцца», «змякчаюцца» імі.

Вячаслаў Адамчык – прадстаўнік пакалення, якое перажыло вайну, выжыла, нягледзячы ні на што. Боль перанесенага і перажытага зрабіў душы «дзяцей вайны» (П. Панчанка) уражлівымі, чулымі. Вострая памяць пра мінулую вайну адчувальна прысутнічае ў многіх творах беларускага празаіка, які ўжо на пачатку свайго творчага шляху піша лепшыя ваенныя апавяданні («Па часе», «Раяль з адламаным вечкам», «Салодкія яблыкі»), паказвае вайну вачыма дзяцей: «Быў іншы свет, было маё дзяцінства. Было яно даўно – перамешанае вайною і страхам» [2, с. 116]. У душы маленькіх герояў пісьменніка

тоіцца глыбока затоены боль, смутак пакалечанага маральна дзіцяці, у якога вайна адабрала радасць маленства, прымусіла рана пасталець. Драматызм гэтых апавяданняў глыбейшы дзякуючы таму, што трымаецца на вострым псіхалагічным матыве: свой позірк мастак слова засяроджвае на духоўным абліччы маленькіх герояў, імкнецца пранікнуць у самыя патаемныя куткі дзіцячай душы. Апавяданні «Раяль з адламаным вечкам», «Па часе», «Салодкія яблыкі» вызначаюцца выключнай драматычнасцю, эмацыянальнасцю, дакладнасцю і тонкасцю ў раскрыцці псіхалогіі дзіцяці. Празаік здолеў пераканаўча паказаць, як доўга і балюча ў душы дарослага чалавека жывуць дзіцячыя ўспаміны: «Мы яшчэ былі дзеці, але ў нашых вачах стаяла вайна. Мы яе бачылі малымі, каб разумець і ненавідзець дарослымі» [2, с. 125].

Такім чынам, прадметам адлюстравання ў ранніх апавяданнях Вячаслава Адамчыка з'яўляецца духоўнае жыццё чалавека, свет яго ідэй і пачуццяў. Пісьменнік-шасцідзесятнік – прыхільнік лірызаванага, псіхалагічнага пісьма, які імкнецца да скрупулёзнага, яскравага выяўлення ўнутранага стану персанажаў, іх душэўнай шчодрасці, тонка адчувае перажыванні тых, пра каго піша. Псіхалагізм дасягаецца стварэннем унутраных маналогаў персанажаў, вобразаў памяці пра мінулае (пазнейшыя прыёмы Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Віктара Казько). Многія творы («Пах летняй травы», «Жывая вада» і інш.) літаральна перанасычаны маналогамі, роздумамі, разважаннямі герояў і аўтара, які з некаторымі з іх зліваецца, пра сэнс жыцця, дабро і зло.

Усе гэтыя асаблівасці ранніх твораў Вячаслава Адамчыка даюць нам права лічыць яго сапраўдным майстрам лірычнай прозы, што было ў духу канца 50-х – пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя.

## ЛІТАРАТУРА

1. ***Караткевіч, Ул.*** Блакіт і золак дня. Апавяданні і аповесці / Ул. Караткевіч. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1961. – С. 13.
2. ***Адамчык, В.*** Дзень ранняй восені. Выбраныя апавяданні / В. Адамчык. – Мінск: Маст. літ., 1974. – С. 145.
3. ***Кожинов, В.В.*** Поэзия и проза / В.В. Кожинов // Литературный энциклопедический словарь. – М., 1987. – С. 294.
4. ***Лецка, Я.Р.*** Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка / Я.Р. Лецка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – С. 42.
5. ***Івашчанка, В.А.*** Жыццё, выказанае словам / В.А. Івашчанка // Полымя. – 1976. – № 7. – С. 215.
6. ***Каваленка, В.А.*** Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў / В.А. Каваленка; рэд. П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – С. 307.
7. ***Мышковская, Л.М.*** О мастерстве писателя. Статьи 1932–1959 гг. / Л.М. Мышковская. – М.: Сов. писатель, 1967. – С. 129.

## SUMMARY

*In this article Viacheslav Adamchyk's creative individuality in Belarusian literature in 50–60s of the XXth century and also the influence of biographic, historic and literary events on his works are being traced. The author of the article analyses peculiar features of V. Adamchyk's lyrical works of small forms, defines his methods of writing such as subjectivity of narration, romantic method of poetical perception, description of the reality and main character's inner world, focus on revealing sensible and psychological side of person's life.*

*Поступила в редакцию 28.06.2007*